**Сёння ў рубрыцы "Мая школа" мы гутарым з самым "модным" чалавекам Беларусі Сашам ВАРЛАМАВЫМ.**



## Саша ВАРЛАМАЎ:

# "Мяне заўсёды цікавіла, адкуль бярэцца жыццё"

### Пра "Ленінградскае" марожанае, песцікі і тычынкі

— Нарадзіўся я ў Мінску недалёка ад пажарнай каланчы на вуліцы Магілёўскай (тады яна называлася Грамадская), — распавядае Саша Варламаў. — Я жыў у вялікім доме з садам у двары, пасярод якога стаяла альтанка. Летам я любіў спаць у гэтай альтанцы. Ноччу было чуваць, як на зямлю падаюць яблыкі. Гэта было вельмі прыгожа і рамантычна... У садзе раслі вішня, агрэст, парэчкі — тое, чым мы, дзеці, заўсёды ласаваліся.

***— А ў якую школу вы пайшлі вучыцца?***

— Спачатку я пайшоў у сярэднюю школу № 1. Правучыўся там тры гады, пасля чаго паступіў у харэаграфічнае вучылішча, якое размяшчалася ў той час у будынку опернага тэатра. Заняткі пачыналіся а восьмай раніцы і заканчваліся позна ўвечары. Так што можна сказаць, што ўсё маё жыццё прайшло тады ў оперным тэатры...

***— З чаго складаўся ваш вучэбны дзень?***

— Пачынаўся ён з нейкага агульнаадукацыйнага прадмета, затым ішоў класічны танец і гэтак далей да самага вечара. У перапынку паміж заняткамітанцамі мы, нават не пераапранаючыся, прыбягалі на адзін з агульнаадукацыйных прадметаў і вучылі "тычынкі з песцікамі"...

А потым — ужо пасля заканчэння вучылішча — я зразумеў, што вельмі баюся сцэны. Падчас рэпетыцый ці выступленняў мяне апаноўвалі комплексы і страх. Прызнацца, я нават саромеўся абедаць: у тэатры оперы была сталоўка для супрацоўнікаў тэатра і навучэнцаў вучылішча, і, калі я заходзіў туды, мне здавалася, што ўсе за мной сочаць, што я раблю ўсё не так. Гэта было сапраўднай пакутай. Зразумела, з цягам часу я авалодаў пэўнымі прыёмамі і спосабамі, якія дапамагалі мне пераадольваць гэтую боязь. Але нават і цяпер я не пазбавіўся ад яе канчаткова.

***— Як жа вы падсілкоўваліся?***

— Праз дарогу было тэатральнае кафэ. Вядома, атрымлівалася крыху даражэй, чым у сталоўцы, але тое кафэ пуставала, прынамсі, калі я туды заходзіў. Там пяклі смачныя бліны і гатавалі суп. А больш за ўсё я любіў купляць каля ГУМа "Ленінградскае" марожанае за 24 капейкі. У нас паміж заняткаў быў перапынак у трыццаць хвілін, падчас якога я сядаў на 38-мы аўтобус, даязджаў да ГУМа і купляў марожанае. Па дарозе назад якраз паспяваў яго з'есці. Але пра гэта ніхто не ведаў, нават мае бацькі.

### Пра вячэрнія коўзанкі, спатканне на даху і апельсін

***— Ці ўзнікалі канфлікты з настаўнікамі?***

— Гэта было проста немагчыма! Якія канфлікты? Калі настаўнік праходзіць міма, ты становішся каля сцяны, прысядаеш і вітаешся. Стаіш на класічным танцы, падымаеш нагу, а настаўнік указкай па назе як ударыць: "Я сказала на 90 градусаў!" — і нага сама падымаецца. Я лічу, што гэта нармальна. А як жа інакш? У тэатры па-іншаму не атрымаецца, тут дэмакратыі быць не можа.

***— На якія прадметы вы хадзілі з большым задавальненнем?***

— У харэаграфічным вучылішчы агульнаадукацыйным прадметам удзялялася мала ўвагі. Сярод любімых былі французская мова, музыка і батаніка. Мова і музыка былі неабходны для танцаў, а батаніка... Мяне заўсёды цікавіла, адкуль бярэцца жыццё. А кругаварот вады ў прыродзе ўвогуле ўяўляўся нейкім дзівам: вада, што з мяне выходзіць, зноў у мяне ўваходзіць... Ну, я — гэта я, а ёсць жа яшчэ людзі, якія памерлі, ёсць каты, сабакі. І што, іх вада таксама ўва мне? А калі я даведаўся, адкуль бяруцца дзеці, для мяне гэта стала сапраўдным шокам. Я тады спытаў: "А што, Ленін таксама гэта рабіў?" — мне адказалі: "Ну, канечне".

***— А каханне сваё першае памятаеце?***

— Так. Была ў нас адна цыганачка. Усе хлопцы былі ў яе закаханы, бо яна выдзялялася сярод астатніх дзяўчат, была самая яркая. Але ёй спадабаўся менавіта я. Узгадваю, як мы аднойчы забраліся на дах майго дома і елі хлеб з яблыкамі.

***— Чым вы займаліся з сябрамі ў вольны час?***

— Вольнага часу ў нас практычна не было. Мы прыходзілі ў вучылішча раніцай, а вярталіся дамоў, калі ўжо было цёмна. Не было вольнага часу — як вынік, не было і сяброў. Былі таварыскія адносіны, але не сяброўскія.



Памятаю, ля галоўнага ўвахода ў оперны былі шырачэзныя спускі ўздоўж прыступак. Па гэтых спусках мы коўзаліся пасля заняткаў. Увечары, калі нас адпускалі пасля рэпетыцыі, мы бралі школьныя партфелі і, як з трампліна, з'язджалі з заснежаных спускаў. Мокрыя, усе ў снезе разыходзіліся па дамах, а раніцай — зноў у школу.

***— Якія яшчэ ўспаміны з тых часоў захаваліся?***

— Я памятаю, як аднойчы па класічным танцы атрымаў пяцёрку. Мама падышла да мяне і сказала: "Вось табе апельсін за пяцёрку". Можаце сабе ўявіць, што значыла па тых часах атрымаць апельсін. А ўвогуле, нейкіх цэласных успамінаў няма. Ёсць дробязі, аўра, уражанні.

***— Як прайшоў ваш выпускны вечар?***

— Я ніколі не хадзіў на выпускныя. Калі атрымліваў дыплом, то для мяне ўсё заканчвалася, наступаў новы перыяд жыцця. Прысутнічаць на выпускным мне было проста нецікава. Праўда, дыплом я адзначаў. Збіраў людзей, якія былі для мяне тады дарагія, і мы ішлі ў кафэ.

***— Падтрымліваеце адносіны са сваімі аднакласнікамі?***

— Я ні з аднакласнікамі, ні з аднагрупнікамі не бачуся і не хачу. Справа ў тым, што мяне цікавіць толькі тое, што адбываецца са мной тут і цяпер, цікавіць не мінулае, а сучаснасць. Людзі мяняюцца, і гэта ўжо не тыя людзі, якіх я ведаў. Ды і я сам з гадамі раблюся іншым.

Мне абсалютна нецікава, што зараз адбываецца з людзьмі, з якімі я вучыўся. Я знаходзіўся з імі па волі лёсу, а не таму, што мне было цікава з імі. Да мяне зрэдку даходзяць чуткі аб тым, што гэты спіўся, той памёр або скурыўся.



### Пра мора, фальклярыстыку і авіярамонтны завод

***— Што было пасля харэаграфічнага вучылішча?***

— Пасля вучылішча паўстала пытанне службы ў войску. У армію я пайшоў. Зразумела, было цяжка, асабліва першы год. Хлопчык з балетнага вучылішча аказваецца ў ракетных войсках стратэгічнага назначэння... Усе чамусьці лічылі, што з мяне можна здзекавацца. У мяне да сённяшняга дня на целе засталіся сляды ад акуркаў, так што можаце ўявіць, наколькі мне было там цяжка. Пазней, калі я ўжо стаў старaслужачым, сітуацыя змянілася: да мяне ўсе праніклісся павагай і сяброўскімі адносінамі, мой аўтарытэт павысіўся. Нават калі камандзіру роты трэба было прыняць нейкае рашэнне, ён заўсёды раіўся са мной.

***— Як складваўся ваш лёс далей?***

— Калі я вярнуўся з войска, то зразумеў, што з тэатрам скончана.

А пасля тэатра самым цікавым для мяне тады было мора. Яшчэ ў чатырнаццаць гадоў маці адправіла мяне да сваякоў у Адэсу. І там употайкі я падаў дакументы ў мараходнае вучылішча. Здаў першы іспыт. А вось падчас другога да мяне падышлі і сказалі: "Вы хварэлі на Боткіна... У мора вас пускаць нельга". Вось так і не спраўдзілася мая мара стаць мараком. Я і сёння, калі бачу мора, то ледзь не губляю прытомнасць.

Быў яшчэ адзін варыянт. Адразу пасля войска я пайшоў працаваць на 407-мы авіяцыйны завод. Спачатку быў вучнем, праз тры месяцы стаў электрамеханікам па рамонце электраабсталявання, праз год — майстрам цэха. Мяне адправілі ў Германію працаваць на самы буйны аэрадром пад Берлінам, дзе базіраваліся савецкія войскі. І менавіта там я зразумеў, што ўвесь гэты час хацеў танцаваць.

Я кінуў цудоўную работу і паступіў у інстытут культуры на харэаграфію. Літаральна з першых жа дзён вучобы я стаў займацца модай як манекеншчык. Мне гэта было цікава. Да таго ж гэты занятак даваў мне магчымасць дадаткова зарабляць грошы.

У інстытуце мяне адразу прызначылі малодшым навуковым супрацоўнікам навукова-даследчай лабараторыі. Усе чатыры гады навучання я быў не толькі студэнтам з павышанай стыпендыяй, але і мадэллю і малодшым навуковым супрацоўнікам.

Потым я паступіў у аспірантуру ГИТИСа. Праз два гады пасля заканчэння інстытута культуры выйшла энцыклапедыя "Этнаграфія Беларусі", якая змяшчала 70 маіх навуковых работ. Паралельна з гэтым я працаваў у беларускім тэатры моды. Калі ў 1987 годзе мы адправіліся ў Маскву на ўсесаюзны конкурс тэатраў моды, наш тэатр заняў першае месца. Нам прапанавалі паўдзельнічаць у святочным пасяджэнні ЦК КПСС у Крамлёўскім Палацы з'ездаў. Пасля гэтага перада мной паўстала пытанне: займацца этнаграфіяй і фальклорам (тады я ўжо лічыўся даволі знакамітым этнографам і фалькларыстам) ці працягваць сваю дзейнасць у тэатры моды. На той момант увесь фальклор быў ужо сабраны, і мне заставалася толькі работа ў архівах, а гэта не самае цікавае. Таму я выбраў тое, чым займаўся з задавальненнем, у чым бачыў сваю будучыню, — моду.

### Пра скураныя курткі, прафесію і гук сняжынкі

***— Не пашкадавалі пра зроблены выбар?***

— Напачатку ўсё складвалася выдатна: прызнанне, шматлікія выступленні, аншлагі, гастролі... Але потым адбылася перабудова, і ўсё скончылася.

У той час мяне падтрымаў Аляксандр Мядзведзь. У яго спартыўным клубе адкрылі невялікае аддзяленне для мяне, там я і пачаў працаваць. Але праз годдва зразумеў, што вынікаў няма. Менавіта тады адна жанчына (на жаль, не памятаю яе імя) сказала мне: "Саша, калі ты перастанеш хавацца за чужымі імёнамі?" Тады быў страх назваць нейкае прадпрыемства сваім імем. Я ж не Кардэн! Тым не менш я прыслухаўся да гэтай парады і назваў рэкламнае агенцтва сваім імем.

У 1994 годзе мяне запрасілі ў берлінскі тэатр моды. Пасля гэтага я змяніўся, Берлін цалкам перавярнуў мае ўяўленні. Калі ў Мінску хадзілі ў спартыўных штанах і скураных куртках, я першы перацягнуў еўрапейскую моду сюды.

Потым было шмат чаго і добрага, і дрэннага. Больш было праблем. Аднойчы я стаў перад выбарам: заставацца тут альбо пераязджаць у Берлін. І тады тагачасны рэктар БДУ прапанаваў мне адкрыць на базе гэтага універсітэта свой офіс.

***— Ваша жыццё, аказваецца, магло скласціся кардынальна розным чынам. Ці можаце вы цяпер уявіць сябе чалавекам іншай прафесіі?***

— Не, мая прафесія мяне цалкам змяніла. Сёння я не марак, я — дызайнер, аўтар праекта "Млын моды". Таму ўявіць сябе ў іншай сферы дзейнасці не магу... Я нават не маю часу для гэтага, настолькі заняты сваёй прафесіяй.

***— Нават і на адпачынак няма часу?***

— Ёсць. Так, нядаўна я адкрыў для сябе Браслаў. Гэта казачнае месца! Вы толькі ўявіце: замерзлае абсалютна белае возера, якое знікае за гарызонтам, і гук сняжынкі, што падае на лёд...

**Гутарыў Дзмітрый ЛАДЗЕС.**

## Прагноз надвор'я

Сёння днём па рэспубліцы чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Паўсходзе краіны ападкі, у асноўным снегі мокры снег. На дарогах галалёдзіца. Вецер паўночна-заходні 5—10 м/с. Тэмпература паветра -3 — +3°C.

У наступныя двое сутак па рэспубліцы чакаецца:

11.02 воблачнае з праясненнямі надвор'е. Ноччу па паўднёвым захадзе, днём на большай частцы тэрыторыі снег, мокры снег, слабы галалёд. На дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёва-ўсходні 5—10 м/с. Тэмпература паветра ноччу 0 — -6°C, па паўночным усходзе да -8°C, днём -3 — +3°C.

12.02 воблачна. Часам ападкі, у асноўным мокры снег, слабы галалёд. Вецер паўднёва-ўсходні, усходні 5—10 м/с. Тэмпература паветра ноччу -4 — +1°C, днём -2 — +4°C.

**Рэспубліканскі гідраметэацэнтр.**